УДК 94(075.8)
ББК 63.3я73
Б142

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

Р э ц э н з е н т ы:
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян БДУ *Л. А. Козік;*
кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны РІВШ *С. В. Паноў*

Пад навуковай рэдакцыяй *А. В. Касовіча*

**Багдановіч, І. І.**
Б142 Методыка навучання гісторыі ў школе ў апісаннях, схемах і табліцах : вучэбна-метадычны дапаможнік / І. І. Багдановіч, А. А. Корзюк ; пад навук. рэд. А. В. Касовіча. – Мінск : БДПУ, 2017. – 20[illegible] с.
ISBN 978-985-541-392-0.

Дапаможнік грунтуецца на кароткіх апісаннях, лагічных схемах і тэкставых табліцах, якія паслядоўна раскрываюць асноўныя праблемы зместу курса методыкі выкладання гісторыі ў сучаснай школе. Утрымлівае кампаненты, неабходныя для арганізацыі самастойнай пазнавальнай дзейнасці студэнтаў і фарміравання ў іх прафесійных кампетэнцый настаўніка гісторыі: прыведзены прыкладны план вывучэння кожнай тэмы, грунтоўны спіс навукова-метадычнай літаратуры і блок самакантролю вынікаў засваення, які складаецца з пытанняў і заданняў і тэставых заданняў па асноўных раздзелах курса методыкі выкладання гісторыі.

Адрасуецца студэнтам вышэйшых навучальных устаноў, выкладчыкам ВНУ і каледжаў, настаўнікам і ўсім, хто цікавіцца методыкай навучання гісторыі.

**УДК 94(075.8)**
**ББК 63.3я73**

**ISBN 978-985-541-392-0**

© Багдановіч І. І., Корзюк А. А., 2017
© Афармленне. БДПУ, 2017

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

*І. І. Багдановіч, А. А. Корзюк*

# МЕТОДЫКА НАВУЧАННЯ ГІСТОРЫІ Ў ШКОЛЕ Ў АПІСАННЯХ, СХЕМАХ І ТАБЛІЦАХ

Рэкамендаваны вучэбна-метадычным аб'яднаннем
па педагагічнай адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага
дапаможніка для студэнтаў устаноў вышэйшай
адукацыі, якія навучаюцца па спецыяльнасцях
1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны,
1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура,
1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа

Мінск
БДПУ
2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# *РАЗДЗЕЛ 6.* ПАЗАКЛАСНАЯ РАБОТА ПА ГІСТОРЫІ

## *ТЭМА 12. ПАЗАКЛАСНАЯ РАБОТА ПА ГІСТОРЫІ. НАСТАЎНІК ГІСТОРЫІ*

### План вывучэння тэмы

1. Агляд метадычнай літаратуры па тэме. 2. Задачы пазакласнай работы. Прынцыпы яе арганізацыі. 3. Змест пазакласнай работы па гісторыі. 4. Асноўныя формы пазакласнай работы па гісторыі ў школе. 5. Настаўнік гісторыі.

### Літаратура для самастойнага вывучэння тэмы


1. Багдановіч, І. І. Методыка выкладання гісторыі ў школе : вучэб. дапам. / І. І. Багдановіч. – Мінск : БДПУ, 2009.

2. Гістарычнае краязнаўства Беларусі : вучэб.-метад. дапам. / І. І. Багдановіч [і інш.] ; пад рэд. А. А. Карзюка. – Гродна : ЮрСаПрынт, 2014.

3. Гончарова, Т. И. Исторические вечера в школе / Т. И. Гончарова. – М. : Просвещение, 1987.

4. Корзюк, А. А. Вывучэнне гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст. у агульнаадукацыйнай школе : вучэб.-метад. дапам. / А. А. Корзюк ; пад рэд. д-ра гіст. навук, праф. М. М. Забаўскага – Мінск : БДПУ, 2010.

5. Корзюк, А. А. Настаўнік гісторыі ў сучаснай школе: штрыхі да прафесійнага партрэта / А. А. Корзюк // Беларускі гістарычны часопіс. – 2016. – № 3. – С. 41–44.

6. Корзюк, А. А. Арганізацыя краязнаўчай работы пры вывучэнні Гісторыі Беларусі ў сярэдняй школе. – Мазыр : Белы Вецер, 2015.

7. Кулагина, Г. А. 100 игр по истории / Г. А. Кулагина. – М. : Просвещение, 1998.

8. Миницкий, Н. И. Методы конструирования научного и образовательного знания : монография / Н.И. Миницкий. – Минск : БГПУ, 2006.





9. Методика историко-краеведческой работы в школе / под ред. М. С. Борисова. – М. : Просвещение, 2002.


### Кароткае апісанне зместу вывучаемай тэмы

1. У метадычнай літаратуры вопыт правядзення пазакласнай работы знайшоў самае шырокае адлюстраванне. Гэтай праблеме прысвечаны сотні артыкулаў, шматлікія дапаможнікі і манаграфіі. Шырокае асвятленне ў метадычнай літаратуры атрымалі розныя напрамкі і формы пазакласнай работы па гісторыі. У першую чаргу неабходна звярнуць увагу на публікацыі, што прыведзены ў рэкамендуемым спіску літаратуры для вывучэння тэмы, а таксама на працы І. З. Азерскага, М. С. Барысава, А. Ф. Родзіна і Ю. В. Сакалоўскага, што былі выдадзены ў 70–80-я гады XX ст.

2. Задачамі пазакласнай работы па гісторыі застаюцца тыя ж, што і перад навучаннем гісторыі ў школе: авалоданне вучнямі асновамі сістэматызаваных ведаў аб сусветна-гістарычным працэсе; далучэнне іх да дасягненняў айчыннай і сусветнай культурай; выхаванне грамадзянскасці, патрыятызму, нацыянальнай самасвядомасці. Аднак у пазакласнай рабоце гэтыя задачы іншымі сродкамі і метадамі і ў іншых арганізацыйных формах.

Пазакласная работа па гісторыі будуецца на іншых, чым вучэбная, прынцыпах арганізацыі. Асноўнымі з іх з'яўляюцца: *дабраахвотнасць*, якая стварае магчымасць арганізаваць дзейнасць вучняў па інтарэсах, садзейнічае развіццю індывідуальных схільнасцей, ініцыятывы і пазнавальнай самастойнасці; *педагагічнае кіраўніцтва з боку настаўніка,* якое ажыцыяўляецца праз аказанне дапамогі школьнікам у вызначэнні задач, асноўных напрамкаў, зместу і форм пазакласнай работы; *самакіраванне* ў межах абраных вучнямі форм (гурткі, таварыствы, клубы, савет музея і г. д.) арганізацыі пазакласнай работы; *галоснасць,* якая рэалізуецца праз інфармаванне школьнай грамадскасці аб стане і выніках пазакласнай работы (аб'явы, інфармацыйныя бюлетэні, насценная газета, інтэрнэт-форумы і г. д.); *грамадска-карысная накіраванасць* пазакласнай работы, якая вызначаецца яе значнасцю ў ажыццяўленні выхавання ў школьнікаў грамадзянскай адказнасці за вынікі сваёй дзейнасці, прапагандзе гістарычных ведаў і захаванні гісторыка-культурнай спадчыны.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ